Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 МАЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 85 (27450) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота БЕЛТА.

ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА НІКОЛІ НЕ СТАНЕ ДАЛЁКІМ МІНУЛЫМ

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі

Дарагія ветэраны!
Паважаныя суайчыннікі і госці сталіцы!

Па добрай традыцыі мы зноў сабраліся тут разам у самым сэрцы горада-героя Мінска, каб адзначыць святое і дарагое свята — Дзень Перамогі.

Мы сустракаем 68-ю гадавіну, 68-ю мірную вясну. На роднай зямлі не чуваць грукату гармат і авіябомб. Зараслі травой бліндажы і акопы. Астылі пачварныя печы канцлагераў. На месцы руін і пажарышчаў узняліся новыя гарады і вёскі.

Зямля залячыла свае раны. Жыццё перамагло смерць. Але для беларускага народа, які прынёс на алтар барацьбы з фашызмам трэць сваіх суграмадзян, вайна ніколі не стане далёкім мінулым. Яна застанецца ў памяці не толькі пакалення пераможцаў, але і іх удзячных патомкаў. Яе ўрокі павучальныя для ўсяго чалавецтва.

Аднак ёсць і тыя, хто пастаянна спрабуе «перагледзець» гісторыю Вялікай Айчыннай. Прынізіць значэнне гераічнай барацьбы савецкіх людзей, ачарніць партызанскі рух і рэабілітаваць фашысцкіх катаў і асабліва іх прыслужнікаў.

Наш абавязак, наша свяшчэнная місія — захаваць праўду аб той вайне, аб легендарным подзвігу савецкага народа. Не дазволіць адабраць у яго галоўную заваёву — Вялікую Перамогу!

Мы заўсёды будзем памятаць аб тым, як з'явіўся на свет вірус карычневай чумы, спароджаны бесчалавечнай ідэалогіяй нацызму і баязлівай палітыкай сусветных дзяржаў. Узгадаваўшы пачвару, яны ж сталі першымі ахвярамі фашысцкай ваеннай машыны.

Пакарыўшы за лічаныя месяцы Еўропу, гітлераўскія легіёны жалезным поступам выйшлі да граніц Савецкага Саюза. Аднак іх стратэгі забылі гістарычную перасцярогу святога абаронца славянскіх зямель Аляксандра Неўскага: «Хто да нас з мячом прыйдзе, той ад мяча і загіне».

Для савецкага народа вайна стала Айчыннай. Мільёны людзей розных нацыянальнасцяў, пакаленняў і сацыяльных слаёў узяліся за зброю. Нават цяжкія страты Чырвонай Арміі ў пачатку вайны не зламалі волю народа, яго гатоўнасць да апошняй кроплі крыві біцца за кожную пядзю роднай зямлі.

На фронце і ў тыле, у партызанскіх атрадах і ў падполлі, у змрочных гета і канцлагерах савецкія людзі здзейснілі подзвіг, роўнага якому няма ў сусветнай гісторыі, ператварыўшы трагедыю ў трыумф, а горыч паражэння — у свята Перамогі.

Беларусь стала першым рубяжом абароны, які не пакарыўся ворагу. Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці, мужнасць соцень тысяч партызан і падпольшчыкаў, доблесць салдат-вызваліцеляў, якія выратавалі нашу Айчыну ад фашысцкага ярма, залатымі літарамі ўпісаны ў скрыжалі айчыннай гісторыі.

Менавіта на землях Беларусі, Расіі і Украіны была спынена нястрымная раней машына вермахта і вырашаны лёс Еўропы. Мы не можам дазволіць забыць аб тым, што менавіта савецкі народ, пайшоўшы на неймаверныя намаганні і незлічоныя ахвяры, унёс вырашальны ўклад у разгром фашысцкай Германіі.

Мы захоўваем памяць пра вялікіх сусветных лідараў Іосіфа Сталіна, Уінстана Чэрчыля і Франкліна Рузвельта, якія, узняўшыся над палітычнымі рознагалоссямі, сфарміравалі адзіны фронт нацый супраць фашысцкага прыгнёту. Мы ўдзячныя ўсім саюзнікам па антыгітлераўскай кааліцыі за ўдзел у агульнай барацьбе з ворагам.

Пад тысячамі помнікаў і абеліскаў, у вядомых і безыменных магілах вечным сном спяць тыя, хто не вярнуўся з гэтай бязлітаснай бойні. І пакуль верціцца зямны шар, пакуль б'юцца нашы сэрцы, мы не забудзем пра іх подзвіг. Не маем права забыць.

Як увасоблены сімвал нашай памяці ў Мінску мы ўзводзім Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны. Велічны мемарыял, які сведчыць аб захаванні праўды пра тыя грозныя гады, з'яўляецца сведчаннем глыбокай павагі да змагароў з фашысцкімі агрэсарамі.

Дарагія сябры! Прапаную ўшанаваць памяць усіх герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны хвілінай маўчання.

(Хвіліна маўчання).

Паважаныя сябры!

Людзі добрай волі, аб'яднаўшы свае намаганні, здолелі спыніць фашызм. Здзейснена справядлівае пакаранне яго ідэйных натхняцеляў і катаў. Але, на жаль, Нюрнбергскі працэс, трыбунал, які асудзіў ваенных злачынцаў, не змог вынесці прысуд вайне — самаму страшэннаму злачынству супраць чалавечнасці.

З таго часу, як адгрымелі апошнія залпы над Берлінам, мы не раз станавіліся сведкамі таго, што на розных кантынентах, уключаючы і Еўропу, успыхвалі «гарачыя кропкі», гінулі людзі і цяклі рэкі крыві.

Вайна набывае ўсё новыя абліччы і вядзецца не толькі сілай зброі, але і метадамі палітычнага і інфармацыйнага націску, эканамічнага шантажу, пагроз і санкцый.

Суверэнная Беларусь пастаянна знаходзіцца пад прыцэлам гармат неаб'яўленай халоднай вайны. Сёй-той на Захадзе так і не змог змірыцца з тым, што Беларусь не стала чарговай «бананавай рэспублікай», якая танцуе пад дудку заакіянскіх дэмакратый. Нас душаць санкцыямі, абліваюць брудам паклёпу. Уздоўж нашых граніц лятаюць ваенныя самалёты НАТА, ствараюцца новыя базы, учыняюцца правакацыі.

Але ніхто не прымусіць наш народ звярнуць з выбранага ім шляху. Беларусь няўхільна прытрымліваецца прынцыпаў міжнароднага права, адкрыта для раўнапраўнага супрацоўніцтва з усімі, але выключна на прынцыпах узаемнай павагі і даверу.

Пры гэтым мільёны грамадзян Беларусі цвёрда стаяць на варце суверэнітэту сваёй дзяржавы. У сучасных умовах абарона Радзімы набывае сапраўды ўсенародны характар, у аснове якога — патрыятызм і гатоўнасць кожнага адстаяць незалежнасць беларускай дзяржавы.

Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь складаюць аснову гэтага шчыта Айчыны. Наша дзяржава фарміруе ваенную дактрыну зыходзячы выключна з прынцыпаў абароннай дастатковасці і стратэгічнага стрымлівання патэнцыяльнай агрэсіі, у поўным аб'ёме выконвае свае абавязацельствы ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Магістральным напрамкам нашага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы з'яўляецца ўзаемадзеянне з брацкай Расіяй. Улічваючы новыя выклікі і пагрозы нашай бяспецы, мы імкнёмся ўмацаваць сістэму проціпаветранай абароны, каб забяспечыць недатыкальнасць граніц дзяржавы і яе суверэнітэт. Падкрэсліваю: новыя комплексы і самалёты — гэта выключна абарончая зброя. І мы будзем мець іх столькі, колькі неабходна для бяспекі нашай дзяржавы. Ваенныя дактрыны Беларусі і Расіі не прымаюць перспектывы вайны. Чужых зямель нам не трэба. Але і свае будзем берагчы як зрэнку вока, навучаныя вопытам мінулых пакаленняў і сучаснымі трагічнымі падзеямі. Таму мы зробім усё магчымае для абароны рубяжоў Саюзнай дзяржавы і ўмацавання братэрства па зброі.

Дарагія ветэраны!

У сваім слаўным мінулым народы заўсёды шукаюць крыніцу, якая ўмацуе іх духоўныя сілы. Памяць пра Вялікую Айчынную вайну, пра ваш подзвіг неабходна нам, каб, натхняючыся веліччу былога, упэўнена ісці ў заўтрашні дзень.

Прыміце нашу вялікую падзяку за гэта свята. За мірнае неба над галавой, за падоранае нам жыццё. За гэту цудоўную краіну, якая будуецца, расце і прыгажэе з кожным днём.

Я ўпэўнены, што нашы дзеці, унукі і праўнукі захаваюць і прымножаць завешчаныя вамі традыцыі доблесці і мужнасці.

Я ад усёй душы віншую вас, дарагія ветэраны, усіх жыхароў і нашых гасцей са святам Вялікай Перамогі.

Жадаю вам, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, поспехаў, дабрабыту, шчасця і працвітання.

З Днём Перамогі, дарагія сябры!

Фота БЕЛТА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ГЭТА НАША ПАМЯЦЬ

Нашчадкі пакалення пераможцаў павінны захаваць традыцыі і памяць пра подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, размаўляючы з журналістамі пасля святочных мерапрыемстваў ля манумента Перамогі ў Мінску, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем заўважыў, што з кожным годам становіцца ўсё менш ветэранаў, якія прайшлі вайну. «Калі апошні салдат Вялікай Айчыннай сыдзе з гэтага жыцця, у краіне многае зменіцца. Гэта сапраўды так. Яны — наша памяць, і не толькі памяць, гэта тыя людзі, якія прынеслі і падарылі нам усё тое, што мы сёння маем», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што галоўнае для іх сёння — гэта жыць.

На думку кіраўніка дзяржавы, каб такіх сумных падзей у гісторыі больш не паўтарылася, наступныя пакаленні павінны памятаць, увасабляць гэтую перамогу ў розных падзеях, помніках, мерапрыемствах. «Хоць усяго гэтага ў нас дастаткова, — сказаў Прэзідэнт. — Галоўнае — захаваць традыцыі. Пра гэта трэба казаць, распавядаць пра вайну дзецям».

Прэзідэнт расказаў, што сёння побач з ім падчас святочнага шэсця ішоў касманаўт Алег Навіцкі, які нядаўна вярнуўся з калязямной арбіты. «Ён мне распавёў, што першае, што ён зрабіў, калі яго дачка пачала нешта разумець, павёз яе ў Брэсцкую крэпасць, Хатынь, паказаў і расказаў, якой была вайна, хоць сам у ёй не ўдзельнічаў, і гэта зрабіла на яе моцнае ўражанне, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Вось калі кожны з нас будзе так ставіцца да гэтага подзвігу, расказваючы пра яго сваім дзецям, я ўпэўнены, нашы паслядоўнікі, нашы дзеці ніколі гэтага не забудуць».

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што Беларусь заўсёды будзе адстойваць бяспеку сваіх межаў. «Я не нагнятаю абстаноўку, але сітуацыя на межах нашай краіны неспакойная. Яна схаваная, можа, крыху ад народа, і калі там нешта і адбываецца, мы не стараемся гэта разгортваць, раскручваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Але разумееце: ужо вельмі свярбяць у кагосьці рукі, ходзяць і шчоўкаюць зубамі ўздоўж мяжы, з нянавісцю гледзячы на нашу краіну. Паўстае пытанне: за што? За тое, што мы іх у свой час выратавалі і на алтар чалавецтва паклалі трэць нашага насельніцтва? Гэта несправядліва, несумленна, і супраць гэтай несправядлівасці мы заўсёды будзем паўставаць сваімі сэрцамі, розумам, а калі трэба і са зброяй у руках. Мы гэта гаворым заўсёды сумленна і адкрыта», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што яго першачарговая задача як Прэзідэнта — забяспечыць бяспеку межаў. «І мы яе разам з вамі забяспечым», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт павіншаваў усіх, хто ваяваў і хто паважае Перамогу продкаў, з гэтым вялікім святам.

Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь.

Для сапраўднага грамадзяніна няма нічога больш святога і дарагога, чым герб і флаг роднай краіны. Гледзячы на іх, кожны з нас адчувае сябе неад'емнай часткай адзінай вялікай сям'і, імя якой — беларускі народ.

Нашы герб і флаг — адлюстраванне велічы і прыгажосці роднай зямлі, пераемнасці гістарычных традыцый і непарыўнай сувязі мінулага, сучаснасці і будучыні краіны, мірнага, стваральнага характару беларусаў. З імі, выбранымі воляю народа галоўнымі сімваламі нашай суверэннай дзяржавы, мы ўпэўнена ідзём наперад да агульнай мэты — пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі.

Шанаваць і паважаць свае герб і флаг — абавязак і справа гонару кожнага беларуса. Няхай гэтыя найвялікшыя нацыянальныя каштоўнасці асвятляюць самыя важныя падзеі нашага жыцця, напаўняючы сэрцы высокімі пачуццямі любові да Айчыны і адказнасці за яе лёс.

У гэты святочны веснавы дзень зычу вам, дарагія землякі, моцнага здароўя, радасці, шчасця, дабрабыту і поспехаў у працы на карысць Радзімы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

15 мая — «прамая лінія» «Звязды» па пытаннях вайсковай службы

На пытанні, звязаныя з парадкам прызыву і праходжаннем тэрміновай ваеннай службы, а таксама са зменамі, якія плануюцца ў будучыні, 15 мая з 16 да 17 гадзін адкажа **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прызыву галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, палкоўнік Андрэй Юр'евіч МУРАШОЎ**. Тэлефануйце ў гэты дзень па тэлефонах: **287 18 66, 287 18 71.** Задавайце свае пытанні загадзя па тэлефонах **287 19 42, 292 31 21** ці па электроннай пошце **info@zvyazda.minsk.by**. Вам адкажуць!

УСЕ Ў ПАРК!

Аматары друкаванага слова сабраліся ў парку імя Горкага на першы фестываль сталічных сродкаў масавай інфармацыі

Кожны госць меў магчымасць бліжэй пазнаёміцца з самымі рознымі выданнямі — ад рэспубліканскіх да заводскіх шматтыражак. «Прызямліўся» ў парку і звяздоўскі дэсант.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Арганізатарам фестывалю стала Агенцтва «Мінск-Навіны» пры садзейнічанні Міністэрства інфармацыі краіны і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Больш за дзесяць прэзентацыйных стэндаў з'явілася на алеі каля галоўнага ўвахода ў парк. Сапраўдны ажыятаж вакол іх узнік апоўдні, нягледзячы на нязвыкла спякотнае надвор'е. Школьнікі, людзі сярэдняга ўзросту, пенсіянеры імкнуліся займець у падарунак прыгожы каляндарык, сцяжок ці паветраны шарык з сімволікай выдання. А на нашым стэндзе была арганізавана выстава газет і часопісаў выдавецкага дома «Звязда». І гэта яшчэ не ўсё — кожны мог набыць кнігі сучасных беларускіх пісьменнікаў на розны густ: ад ваеннай літаратуры да дзіцячых твораў. Сапраўдная чарга ўтварылася да прафесійнага мастака Аляксандра Каршакевіча, які за лічаныя хвіліны маляваў шаржы на ўсіх ахвотных.

— Па праўдзе кажучы, я прыемна здзіўлены, — гаворыць Іван Хомчанка, адзін з наведнікаў стэнда «Звязды». — Гэта ж толькі на днях скончылася выстава «СМІ ў Беларусі», і вось зноў з'явілася цудоўная магчымасць пабачыць на свае вочы аўтараў сталічных выданняў і пагутарыць з імі ў святочнай абстаноўцы. Ды і «Звязда» для мяне — больш чым газета. Гэта крыніца чыстай беларускай мовы сярод трасянкі, якая зараз пануе. Увогуле хочацца, каб такія добрыя мерапрыемствы праводзіліся часцей — выйграюць ад гэтага ўсе.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВІНШАВАЛЬНЫЯ ПАСЛАННІ АД ЛІДАРАЎ КРАІН СНД З НАГОДЫ ДНЯ ПЕРАМОГІ

У адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі паступілі віншавальныя пасланні ад лідараў краін СНД з нагоды чарговай гадавіны перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасці, у віншаванні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна адзначаецца, што гэта свяшчэнная дата навекі ўпісана ў гісторыю Расіі і Беларусі. Уладзімір Пуцін выказаў перакананне, што брацкая дружба, загартаваная ў гады Вялікай Айчыннай вайны, будзе і ў далейшым служыць надзейнай асновай для ўмацавання саюзніцкіх адносін паміж дзвюма краінамі.

Прэзідэнт Расіі таксама перадаў ветэранам, якія пражываюць у Беларусі, самыя цёплыя віншаванні, пажаданні здароўя і дабрабыту.

СЛАВІМ ТВОЙ ПОДЗВІГ, САЛДАТ!

У цэнтры старажытнага Віцебска 9 мая, як той казаў, яблыку не было дзе ўпасці: дзясяткі тысяч чалавек прыйшлі ў гэты вельмі цёплы дзень, каб паўдзельнічаць у святочных мерапрыемствах. Не дзіва, што эпіцэнтрам святкавання стала плошча Перамогі.

Тут адбылася канцэртна-забаўляльная праграма, былі арганізаваны спартыўныя гульні. А недалёка — у парку Пераможцаў — прайшла святочная акцыя «Славім твой подзвіг, Бацькаўшчыны салдат!». Таксама тут была арганізавана работа комплексу атракцыёнаў, аб'ектаў гандлю. Святкаванне Перамогі 9 мая завяршылася шыкоўным феерверкам.

А напярэдадні свята старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Косінец сустрэўся з тымі, каму мы заўсёды будзем удзячны за перамогу — у Віцебскім аблвыканкаме адбыўся святочны прыём ветэранаў Вялікай Айчыннай.

На сустрэчу з губернатарам прыйшлі ў тым ліку і былыя партызаны, і тыя, хто змагаўся за перамогу ў падполлі.

— Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны ў нашай дзяржаве на асаблівым рахунку, — падкрэсліў губернатар. — Салдаты Вялікай Перамогі і сёння ўносяць вялікі ўклад у развіццё краіны, неацэнная іх праца па патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення.

На жаль, з кожным годам усё меней сярод нас пераможцаў. На Віцебшчыне, у прыватнасці, пражываюць толькі трохі больш за 3,6 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАША ПАМЯЦЬ Б'Е Ў ЗВАНЫ

Калі пра вайну і перамогу гаварыць у Брэсце, то гэта, найперш, Брэсцкая крэпасць. У дзявяты дзень мая сюды, здаецца, ідзе ўвесь горад. І на гэты раз з самага ранку ў цытадэль рухаліся патокі людзей. Ішлі арганізаванымі калонамі: гэта працоўныя або студэнцкія калектывы. Ішлі сем'ямі з малымі і старэйшымі дзецьмі. Цікава, што многіх пажылых гараджан, якія не вылучаюцца здароўем, не спыняе нават тое, што з дому ім даводзіцца выходзіць за дзве гадзіны да мерапрыемства. Што ж казаць пра ўнукаў? Усе ўдзельнікі ўрачыстасцяў да плошчы Цырыманіялаў пехатой адольваюць каля двух кіламетраў. Выключэнне робіцца толькі для ветэранаў: іх падвозяць спецыяльным транспартам.

Не раз і ад розных людзей даводзілася чуць, што менавіта ў крэпасці яны адчуваюць сябе сапраўднымі брастаўчанамі. Сапраўды так, за яе межамі мы, відаць, не адрозніваемся ад жыхароў іншых гарадоў. А тут, сярод велічных манументаў і гістарычных будынкаў, ахоплівае асаблівае пачуццё. Тут і словы на мітынгу гучаць асабліва пранікнёна, яны не здаюцца пафаснымі альбо дзяжурнымі.

Урачысты мітынг з нагоды Дня Перамогі адкрыў старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар. Губернатар яшчэ раз нагадаў пра подзвіг маленькага гарнізона крэпасці, дзякуючы якому вораг пацярпеў, па сутнасці, першае сваё паражэнне. Кіраўнік вобласці выказаў словы найвялікшай падзякі ветэранам і заклікаў маладых годна шанаваць памяць аб мужнасці і ахвярах.

Успаміны абаронцы крэпасці Пятра Паўлавіча Кацельнікава зноў вярнулі ў 1941 год, калі на галовы горада, які спіць, абрынулася вайна. «Тое, што мы перажылі, не павінна паўтарыцца», — галоўнае, што ветэран ужо шмат гадоў спрабуе данесці да свядомасці новых пакаленняў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

■ Такі шлях

НАВОДЧЫК, РАЗВЕДЧЫК І СПЕЦВАДЗІЦЕЛЬ

Ганароваму ветэрану аб'яднання ветэранаў Камітэта дзяржаўнай бяспекі Мікалаю Прадко — 85 гадоў. У свой час ён быў і наводчыкам, і разведчыкам, і не зусім звычайным кіроўцам. Мікалай Уладзіміравіч пакінуў на фронце здароўе і сёння мае патрэбу ў пастаяннай медыцынскай дапамозе. Аднак памяць яго па-ранейшаму не падводзіць — з лёгкасцю прыгадвае, як яно тады было.

Трапіў на вайну ў 1944-м, калі яму споўнілася 18. Што называецца, за пару дзён асвоіў зброю, стаў мінамётчыкам-наводчыкам.

— Адкрытая мясцовасць, назіральны пункт — непадалёку ад лесу, — расказвае Мікалай Уладзіміравіч. — Наш з Якубавым мінамёт выкарыстоўвалі для прыстрэлкі. Мы вылучаліся дакладным пападаннем, таму і апынуліся на назіральным пункце... Пачалася атака. Я даю адпаведную каманду тэлефаністу: які прыцэл і г.д. Той кажа: няма боепрыпасаў, міны не падвезлі... І атрымліваю загад: адступаць! А гэта ж азначае, што трэба скруціць тэлефонны кабель, перайсці на новае месца, зноў разгарнуцца... А немцы ўжо ў 500-х метрах... Я загад не выканаў... Памочнік мой прыгадаў, што непадалёку ў разбітых грузавіках бачыў нямецкія міны... На шчасце, яны падыходзілі для нашых мінамётаў. Я аказаўся і наводчыкам, і мінамёт заражаў. Нічога не чуў, не бачыў... Бой быў цяжкі, цягнуўся некалькі гадзін. Ніводная міна не дала асечкі. Атаку мы адбілі. І за той бой мне ўручылі медаль «За адвагу».

У разведку Мікола трапіў таму, што добра ведаў нямецкую мову. А вывучыў яе... па слоўніках, у акопах... У 1945-м Прадко разам з напарнікам Юрчанкам, апранутыя ў форму вермахта, перабіраліся за лінію фронту — каб сабраць інфармацыю аб наяўнасці тэхнікі ў праціўніка.

«З'ездзі да мяне дадому, вазьмі кашалёк на тумбачцы і прывязі». Я адмовіўся спачатку, але той настаяў... Я ўзяў ключ і выканаў просьбу...

— Нам тады не пашчасціла, — узгадвае Прадко. — Натрапілі на траіх гітлераўцаў і давялося ўвязацца ў перастрэлку. Куля трапіла ў запальніцу, якая ляжала ў кішэні... Рыкашэтам — у жывот... Юрчанку таксама параніла... Як ён ратаваў мяне — не ўяўляю... Можа, дні тры давялося сядзець галоднымі ў балоце... Урач пасля сказаў, што з такім сляпым кулявым раненнем жывата, з пашкоджаннем тонкага кішэчніка і мачавога пузыра, у мяне амаль не было шанцаў выжыць...

Дзень Перамогі Мікалай Уладзіміравіч сустрэў у Смаленску, у шпіталі. Калі падлячылі — накіравалі ў пераходны пункт Калінін, каб адправіць у Японію... Аднак пакуль ехалі цягніком да Навасібірска, вайна ўжо скончылася. Адтуль давялося вярнуцца ў Падмаскоўе, пасля — у Беларусь, на ліквідацыю бандаў. «Недабіткаў» было шмат у Мінскай і Брэсцкай абласцях. Недзе да сярэдзіны 1950-х работы ў гэтым сэнсе хапала.

— Я застаўся працаваць у камітэце і адпрацаваў увогуле каля 40 гадоў, — дадае Прадко. — У 1956-м быў кіроўцам, вазіў старшыню КДБ пры Савеце Міністраў БССР Аляксандра Перапяліцына. Ён быў вельмі інтэлігентным і пунктуальным. Я ніколі не спазняўся. За рулём быў у касцюме, пры гальштуку... Выпіваць прапаноўвалі, і не раз, але я ніколі не браў чарку... Давялося вадзіць і «Чайку», і «Победу», і «Волгу»... Старшыні КДБ мне даверялі... Калі Перапяліцын пайшоў на павышэнне ў Маскву, я пачаў вазіць Васіля Іванавіча Пятрова... Неяк ён мяне папрасіў: «З'ездзі да мяне дадому, вазьмі кашалёк на тумбачцы і прывязі». Я і адмовіўся спачатку, але той настаяў... Я ўзяў ключ і выканаў просьбу...

Але не кожную просьбу Прадко выконваў «у абавязковым парадку». Неяк вёз з Аксакаўшчыны ў Мінск намесніка старшыні КДБ Валянціна Буевіча. Па дарозе прыхапілі з сабой двух работнікаў ЦК. Надвор'е дрэннае, снег, бачнасць нулявая, а напярэдзе яшчэ грузавік, дый дарога пайшла на пад'ём... Абганяць рызыкоўна. Тым не менш адзін з работнікаў ЦК выказаў сваю незадаволенасць: маўляў, калі б за рулём сядзеў мой кіроўца, мы б даўно ўжо былі ў сталіцы. Мікалай Уладзіміравіч не прамаўчаў: «Хочаце — выклікайце верталёт, у машыне тэлефон ёсць... А іначай будзем на Маскоўскіх могілках».

Прадко шмат разоў адзначалі ўзнагародамі. Была і «падзяка за выключна добрасумленнае выкананне службовага абавязку па забеспячэнні Алімпійскіх гульняў 1980 года», падпісаная Андропавым. А адзін французскі вучоны, якога давялося падвезці ад Акадэміі навук да аэрапорта, так і сказаў: «Вы — вадзіцель экстра-класа».

Пасля звальнення з органаў вазіў яшчэ віцэ-прэзідэнта НАН Сцепаненку, іншых акадэмікаў. З вучонымі Прадко працаваў толькі пры дапамозе запісак. Прасіў, каб яму пісьмова пазначалі, у колькі каго сустрэць. Бо, бывала, скажуць сустрэць, а потым забудуць пра гэта. Ну, непанятлівыя людзі...

— Я быў проста кіроўцам, — усміхаецца Мікалай Уладзіміравіч. — Вазіў і замежнікаў, калі да нас наведваліся сур'ёзныя дэлегацыі, і Брэжнева вазіў, калі той сюды прыязджаў...

Сёння Мікалай Уладзіміравіч актыўна ўдзельнічае ў жыцці Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў Камітэта дзяржбяспекі «Гонар», сустракаецца з моладдзю.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Погляд

БЫЦЬ СПАДКАЕМЦАМІ ПАКАЛЕННЯ ПЕРАМОЖЦАЎ

Кожны раз, калі набліжаецца Дзень Перамогі, наша грамадства ўспамінае пра ветэранаў, беды вайны і гонар пераможцаў. І гэта, зразумела, правільна і неабходна. Але жывых ветэранаў становіцца ўсё менш, беды вайны аказваюцца ўсё далей ад нас, а проста ганарыцца Перамогай, якую здабывалі не мы, становіцца неяк няёмка.

Усе краіны, якія лічаць сябе безумоўнымі спадкаемцамі Вялікай Перамогі 1945 года (а гэта, перш за ўсё, Беларусь і Расія) стаяць перад тварам сур'ёзнай, складанай праблемы — праблемы разумення Перамогі ці, што тое ж самае, узнаўлення яе сэнсу. Бо сэнс як прадукт разумення — гэта, перш за ўсё, правільная сувязь паміж знакамі і рэальнасцю нашай дзейнасці. А гэта значыць, што кожнае пакаленне разумее Вялікую Перамогу наноў і тое ж трэба рабіць нам.

Сучасная беларуская дзяржаўнасць непарыўна звязана з гэтай сусветна-гістарычнай падзеяй. Сувязь, вядома ж, замацавана ў зацверджанай на рэферэндуме даце Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь — 3 ліпеня, у гадавіну вызвалення Мінска ад нацысцкіх войскаў. Аднак гэтая сувязь таксама ўпісана ў аналы сусветнай гісторыі рукой міністра замежных спраў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Кузьмы Венядзіктавіча Кісялёва, які падпісаў ад імя нашай краіны Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 1945 годзе. Дзякуючы гэтаму дзеянню Беларусь увайшла ў лік краін-заснавальніц ААН і афіцыйна стала суб'ектам сусветнай палітыкі, гэта значыць, адбылася як дзяржава. Таму для Беларусі праблема разумення Вялікай Перамогі мае прынцыповае значэнне.

У чым складаецца сусветна-гістарычны сэнс Перамогі над нацызмам з пункту гледжання сучаснай сітуацыі на нашай планеце?

Перш за ўсё, у тым, што любыя формы грамадскага ладу, пабудаваныя на аснове ідэі расавай, нацыянальнай, рэлігійнай і іншай выключнасці, абарочваюцца людажэрствам і варварствам і будуць выклікаць агульную нянавісць народаў. Менавіта нацыстам належыць аўтарства геніяльнага ў сваім родзе тэрміна «жыцця, не вартае жыць» (lebensunwurtige Leben) і бліскучай у сваім родзе практыкі прымянення гэтага тэрміна ў палітыцы. Аднак гэтая гісторыя непасрэдна тычыцца і сучаснага свету. Мы бачым, што ў пэўных колах ёсць вельмі моцнае жаданне арганізаваць выхад з глабальнага крызісу, створанага пераважна гэтымі ж коламі, за кошт спіхвання абсалютнай большасці насельніцтва планеты ў архаіку (накшталт Лівіі ці Сірыі) або проста галодную смерць (накшталт Самалі, Эфіопіі і іншых краін Афрыкі). І хоць ідэалогія «выбраных» дапускае і нават мае на ўвазе транснацыянальны яе характар, наўрад ці сацыяльны расізм (у форме, перш за ўсё, «алігархічнага інтэрнацыяналу») можна лічыць менш пагрозлівым, чым расізм на нацыянальнай ці іншай глебе.

Другі найважнейшы аспект сэнсу Вялікай Перамогі ў тым, што любыя віды светабудовы, створаныя на падставе ідэі глабальнага панавання, таксама абарочваюцца людажэрствам і варварствам і, больш за тое, у канчатковым выніку, з'яўляюцца неаддзельнымі ад расізму. Нацысты хацелі заваяваць і заняволіць не толькі планету Зямля, але ўвесь Сусвет — менавіта такі размах прэтэнзій абгрунтоўвала вядомая дактрына «спадчыны продкаў». У сучасным свеце стаўкі ў барацьбе таксама ніяк не меншыя: той, хто першым ажыццявіць індустрыялізацыю на аснове новага тэхналагічнага ўкладу, будзе не толькі дамінаваць у свеце, але і стане гаспадаром будучыні, уключаючы такія яе аспекты, як асваенне космасу, новых відаў энергіі і гэтак далей. Аднак сёння з'явілася вельмі небяспечная новая опцыя: замест таго, каб выбівацца наперад у тэхналагічнай гонцы, ці не прасцей заняцца прыгнётам здольнасці іншых у ёй удзельнічаць? Калі мы адказваем на пытанне сцвярджальна, то лагічным з'яўляецца фарміраванне глабальнай дыктатуры варварства, накіраванай супраць сусветнага развіцця.

Трэці аспект сэнсу Вялікай Перамогі, актуальны для сучаснай міжнароднай сітуацыі, у тым, што ўсялякія спробы падладжвацца пад тых, хто выступае супраць сусветнага развіцця, дрэнна заканчваюцца. Лакальныя палітычныя саюзы, альянсы, кампрамісы магчымыя і неабходныя. Аднак будавацца яны могуць толькі на аснове дакладнага і цвёрдага разумення інтарэсаў суверэннага развіцця, у тым ліку — у іх супрацьпастаўленні іншым інтарэсам. Калабарацыянізм як ідэалогія і пазіцыя заўсёды вядзе да паразы.

Чацвёрты аспект сэнсу Вялікай Перамогі з'яўляецца спецыфічным менавіта для сучаснай Беларусі. І заключаецца ён у тым, што рэгіён Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і канкрэтна тэрыторыя нашай краіны ніколі не застаецца ў баку ад глабальных працэсаў. «Хто валодае Усходняй Еўропай, той валодае Хартлендам, хто валодае Хартлендам, той валодае Сусветным востравам, хто валодае Сусветным востравам, той валодае светам», — так абвяшчае вядомая і заўсёды актуальная геапалітычная максіма. Таму спадзявацца на тое, каб застацца ў баку ад узрушэнняў — палітычна-вайсковых, эканамічных ці іншых — Беларусь не можа. Швейцарыя ці Швецыя, ці якая-небудзь лацінаамерыканская краіна — магчыма, але не Беларусь. Адзіны шлях у гэтай сітуацыі — прыняць удзел у глабальнай тэхналагічнай гонцы і ўзаемадзейнічаць з іншымі краінамі на аснове платформы сусветнага развіцця. Падобна да таго, як Мінск здолеў прапанаваць экспарт інстытутаў развіцця для Венесуэлы, Кітая і зусім нядаўна — Інданезіі, у бліжэйшыя месяцы Беларусь павінна стаць ініцыятарам распрацоўкі праграмы развіцця і рэіндустрыалізацыі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Нарэшце, пяты і, магчыма, галоўны аспект сэнсу Вялікай Перамогі заключаецца ў тым, што сілы, якія робяць стаўку на падзел чалавецтва і спыненне развіцця, урэшце непазбежна прайграюць. Гэтыя сілы могуць дамагчыся дамінавання, нават вельмі працяглага дамінавання. Але да тых часоў, пакуль існуе чалавек з яго імкненнем да годнасці, свабоднага выбару паміж дабром і злом, да пазнання нязведанага і стварэння прыгожага, ідэалогія расізму, глабальнай гегемоніі і дэградацыі не можа перамагчы.

Разумець гэта, верыць у гэта і дзейнічаць адпаведна гэтаму — святы абавязак усіх, хто жадае лічыць сябе паўнапраўнымі нашчадкамі пакалення Пераможцаў.

Юрый ЦАРЫК,
палітычны аналітык,
кіраўнік Беларускай групы развіцця

У межах акцыі «Гонар і доблесць» узнагароджаны 33 намінанты

На ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання намінантаў Рэспубліканскай акцыі Міністэрства ўнутраных спраў «Гонар і доблесць» міністр ўнутраных спраў Ігар Шуневіч падзякаваў ветэранам за іх вопыт і актыўную жыццёвую пазіцыю, а таксама падкрэсліў, што супрацоўнікі ведамства штодня выконвалі і выконваюць небяспечную, цяжкую працу, да якой ставяцца вельмі адказна.

Лепшыя з лепшых былі ўзнагароджаны сёлета ў намінацыях «Яны змагаліся за Радзіму», «За мужнасць і гераізм», «За высокі прафесіяналізм у барацьбе са злачыннасцю», «Абаронім жыццё і здароўе нацыі», «За ахову грамадскага спакою», «За супрацьдзеянне злачыннасці ў галіне высокіх тэхналогій», «За ўмацаванне добрых сямейных традыцый».

Адной з узнагароджаных у намінацыі «За супрацьдзеянне злачыннасці ў галіне высокіх тэхналогій» стала, напрыклад, падпалкоўнік міліцыі Марына Якубоўская, старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах аддзела па раскрыцці злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у галіне высокіх тэхналогій МУС. Толькі летась на падставе яе аператыўных распрацовак заведзена дзевяць крымінальных спраў з ліку цяжкіх і асабліва цяжкіх, выяўлены тры злачынныя групы. Адну з іх склалі чацвёра мінчан, якія яшчэ ў 2010-м у Мінску і Кіеве нібыта гандлявалі антывірусным праграмным забеспячэннем, а на самой справе атрымлівалі звесткі аб асабістых даных карыстальнікаў глабальнай сеткі, рэквізітах іх банкаўскіх пластыкавых картак. Зламыснікі скралі такім чынам каля 5 млрд беларускіх рублёў. Сумесна з праваахоўнікамі Украіны і ЗША злачынная група была затрымана.

«За ахову грамадскага спакою» адным з лепшых прызнаны Аляксандр Байдун, участковы інспектар інспекцыі па справах няпоўнагадовых Цэнтральнага РУУС г. Мінска. Летась ён раскрыў тры злачынствы па лініі крымінальнага вышуку, сабраў тры матэрыялы на пазбаўленне бацькоўскіх правоў, склаў 23 пратаколы аб адміністратыўных правапарушэннях, паставіў на ўлік дзевяць няпоўнагадовых, а таксама выявіў шэраг фактаў продажу алкаголю падлеткам.

У ліку ўзнагароджаных у намінацыі «Абаронім жыццё і здароўе нацыі» — намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Сяргей Колтун. На працягу сямі гадоў пад яго кіраўніцтвам ліквідавана 13 злачынных арганізацый і 44 групы, якія займаліся гандлем людзьмі, перакрыта 480 каналаў вывазу беларускіх грамадзян для эксплуатацыі за мяжой. Выяўлена звыш 3 тысяч пацярпелых і асуджана звыш тысячы зламыснікаў. Пад кіраўніцтвам Сяргея Колтуна вядзецца барацьба з секс-турызмам, дзіцячай парнаграфіяй і педафіліяй. Летась у рэспубліцы выяўлена 40 злачынных фактаў вырабу і распаўсюджвання порнапрадукцыі з удзелам няпоўнагадовых.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПАНЯДЗЕЛАК, 13 МАЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 22.50 Зона Х.
9.10 У цэнтры ўвагі.
10.00 Драма «Рыарыта».
12.10, 21.45 Серыял «Сваты-6. За кадрам».
13.15 Вакол планеты.
14.00 Eurovision. Вынікі тыдня.
14.20 Журналісцкае расследаванне.
15.10, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Млын моды-2013.
16.15 Меладрама «Забытая мелодыя для флейты».
19.20 Спецыяльны рэпартаж АТН.
20.00 Форум.
21.00 Панарама.
23.25 Дзень спорту.
23.40 Трагікамедыя «Я застаюся».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Гандлёвы цэнтр».
12.05 «Добрага здаровейка!».
13.10 «Модны прыгавор».
14.15 «Пакуль яшчэ не позна».
15.00 «Георгій Грэчка. Я быў у космасе, я веру ў Бога».
16.15 «Зразумець. Дараваць».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік». «Вольф Месінг: выратавацца ў Беларусі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 «Адкрыты фармат».
21.55 Драма «Воін».
0.30 Начныя навіны.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.05 Дэтэктыў «Развод і дзявочае прозвішча».
10.20 Навіны надвор'я.
10.55, 23.50 Дак. серыял «Цуды прыроды».
11.45 Баявік «Бой з ценем».
15.00 Беларуская часінка.
17.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Данія — Беларусь.
19.35 Меладрама «Прынцэса спецый».
21.25 КЕНО.
21.35 Драма «Блэйз».
0.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00 «Тыдзень».
10.10 «Уявіце сабе».
10.40 «Па законе».
11.10 Серыял «Next 3».
12.55 «Жанчыны XX стагоддзя». «Тры вальсы Клаўдзіі Шульжэнкі».
13.50 «Вялікі горад».
14.30 «Зорны рынг». Новы сезон. Маладзечна супраць Бабруйска.
15.30 «Як трэба».
16.20 «Наша справа».
16.50 Серыял «Следакі».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 Серыял «Слова жанчыне».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Добры вечар, малы.
20.30 Камедыя «Дзевяць ярдаў 2».
23.00 «Ваенная тайна».
0.45 «Пякельная кухня-2».

МІР

5.00 Серыял «Агонь кахання».
6.40 М/ф.
7.05 «Цік-так».
7.20 Серыял «Пяць хвілін да метро».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Разам».
10.00 Маст. фільм «Шлях у «Сатурн».
11.30 «Агульны інтарэс».
12.25 «Агульны рынак».
12.40 «Простая мова».
12.55 Серыял «Управа».
15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.00, 22.45 Ток-шоу «Слова за слова».
18.30 «Акцэнты».
18.45 Серыял «Закон і парадак».
21.25 «Свет Спорту».
21.55 Дак. фільм «У свеце сакрэтных ведаў».
23.35 Серыял «Свецкія хронікі».
1.00 — Прафілактыка.

8 КАНАЛ

7.00, 12.05, 19.05, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20 М/с «Мой маленькі поні».
7.40, 15.05 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
8.30, 17.20 Серыял «Штрафбат».
9.20, 18.15 Серыял «Уздзеянне».
10.00 «TUT woman tv».
10.15 «Сінематограф». Маст. фільм «Афіцэр з ружжай».
12.10 Драма «Варашылаўскі стралок».
13.55 Серыял «Адзінокія сэрцы», 1-я серыя.
16.00 Мультпарад.
16.20 «Мой любімы гадаванец».
16.50 Дак. серыял «Сакрэтны палігон».
19.10 Серыял «Уцёкі».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Кундун».
23.30 «Кінаблакнот».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 17.30 «С.У.П.».
8.30, 14.00, 18.00, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 20.00 Серыял «Кухня».
10.00, 19.00 Серыял «Навіны».
11.00, 13.30 ,17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
12.00 «Практычная магія».
13.00, 16.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
14.30, 23.30 «Улётнае відэа».
15.00 Серыял «Кадэцтва».
16.00, 18.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
21.10 Меладрама «Стань мной».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Ранішняя@пошта».
12.00 «Шукальнікі».
12.50 «Справа Х. Следства працягваецца».
13.50, 16.50, 19.50, 23.15 Навіны — Беларусь.
14.30 «1000 дробязяў». Ток-шоу.
15.10 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.55 «Шукальнікі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
17.45 Вести. Дзяжурная часць.
17.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
18.55 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
20.30 Серыял «Сямейны дэтэктыў».
21.30 Серыял «Людміла».
23.15 «Чужыя тайны. Пары года».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.20 «Справа густу».
10.45 «Да суда».
11.35, 13.25. 16.25 Серыял «Каця. Працяг».
19.35 Серыял «Горы, якія страляюць».
23.05 Сёння. Вынікі.
23.30 Баявік «Мы аб'яўляем вам вайну».

ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 Раніца з ІНТЭРам.
9.10 Маст. фільм «Паміж першай і другой».
10.30 Цацкі для дарослых.
10.50, 17.35, 1.25 Серыял «Жыццё як жыццё».
11.35, 22.50, 6.40 Легенды бандыцкай Адэсы.
12.20, 15.40, 0.25 Дак. серыял «Партрэты дзікай прыроды».
12.40, 18.25, 5.05 Серыял «Анёл-ахоўнік».
13.25, 23.15 Серыял «17 імгненняў вясны».
14.35, 0.45 Судовыя справы.
15.15 Феерыя падарожжаў.
16.00, 4.15 Формула кахання.
16.45 Дак. серыял «Галівудскія пары».
19.05, 2.05 Серыял «Сваты-5».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
21.15, 3.30 Серыял «Галоўныя ролі», 1-я серыя.
22.00, 5.50 Серыял «Вышэйшая мера», 1-я серыя.

КУЛЬТУРА

6.00 «Еўраньюс».
9.00 «Наглядальнік».
10.10 Увесь гэты джаз!
10.20, 0.40 «Пэры Мэйсан». Серыял.
11.15 «Усё жыццё. Марыя Кнебель». Дак. фільм.
11.55, 17.05 «Летні палац і тайныя сады апошніх імператараў Кітая». Дак. фільм. Частка 1-я.
12.50 Важныя рэчы. «Духоўны рэгламент».
13.05 «Станцыйны дазорац». Маст. фільм.
14.10 «Пешшу...» Масква студэнцкая.
14.40, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
14.50 Юрый Багатыроў на тэлебачанні. Дж. Лондан. «Марцін Ідэн». Тэлеспектакль. Частка 1-я.
15.55 «Сусветныя скарбы культуры».
16.15 Радзівон Шчадрын. «Паэторыя». Канцэрт для паэта, змешанага хору і аркестра на вершы Андрэя Вазнясенскага.
18.00 «Кантынент». Частка 1-я.
18.45 Галоўная роля.
19.00 «Саці. Нясумная класіка...».
19.40 «Паліглот».
20.25 «Астравы». Ізабела Юр'ева.
21.05 «Тым часам».
21.55 «Гістарычныя падарожжы Івана Талстога». Фільм 1-ы.
22.20 Увесь гэты джаз!
22.50 «Каралі». Серыял.
23.25 Дакументальная камера. «Жывапіс і кіно: перадумовы дыялогу».
0.15 «Банкет на ўвесь свет».
1.30 С. Пракоф'еў. Сюіта з музыкі да балета «Рамэа і Джульета».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Быў час». 2009 год.
6.00 «Ранішняя пошта» ў Алма-Аце. 1984 год.
6.35 «Што? Дзе? Калі?». Фінальная гульня. 1980 год.
8.00 «Трыбунал» Наталлі Мядзведзевай. 1995 год.
9.00 «Двайныя непрыемнасці». Музычны фільм.
10.30 «Міжнародны турызм у СССР». Дак. фільм.
11.00 «50/50». Тэлешоу. 1994 год.
12.00, 3.00 «Колба часу».
13.00 «Песня застаецца з чалавекам». «Нам патрэбна адна перамога...». 1990 год.
14.05 «Тэатральныя сустрэчы». 1985 год.
15.20 «Славянскі базар». 1992 год.
17.00 «Кліч джунгляў». 1993 год.
17.40 «Гэтыя абаяльныя правінцыялы». Дак. фільм.
18.40 «Жанчыны, якім пашанцавала». 1-я серыя. Маст. фільм.
20.00, 2.00 «Час».
21.00 Народжаныя ў СССР.
22.00 «Трыумф пераможцаў». Канцэртная праграма. 1992 год. 1 частка.
23.00 «Васіль Мяркур'еў». Дак. фільм.
0.30 «Пунсовыя пагоны». Маст. фільм.
1.35 «Мелодыя надзеі». Фільм-канцэрт. 1977 год.
4.00 «Кінапанарама». Па старонках перадач. 1966 год.

MTV

5.00, 3.30 Music.
8.00 Сакрэтныя матэрыялы шоу-бізнесу.
10.00 Трэндзі.
10.30 Тайн.net.
11.30 «Індыга». Маст. фільм.
13.30 Мая цудоўная нянька.
15.10 Арол і рэшка.
17.50, 21.00 Канікулы ў Мексіцы-2.
18.50, 22.30 «Секс у вялікім горадзе». Серыял.
23.40 News блок.
0.10 «Мілыя падманшчыцы». Серыял.
1.50 «Клініка». Серыял.

EUROSPORT

9.30 Аўта і Мотаспорт.
9.45 Фітнес.
10.00, 13.30, 17.00 Веласпорт. Giro d'Italia.
10.45, 14.30. 23.30 Веласпорт: Нацыянальны тур.
11.30, 12.45 Супербайк: Чэмпіянат Свету.
12.15 Суперспорт: Чэмпіянат Свету.
15.15 Снукер.
18.30. 1.45 Футбол: Еўрагалы.
19.15 Усе віды спорту: Вось гэта дзіва!!!
20.00, 21.45, 22.20 Усе віды спорту.
21.00 Баявыя майстэрствы.
21.50, 22.30 Пра рэслінг.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Маст. фільм «Вяртанне рэзідэнта».
8.50, 14.50 Маст. фільм «Канец аперацыі «Рэзідэнт».
11.15, 17.15 Маст. фільм «Майская ноч, або Тапельніца».
18.30, 0.30 Меладрама «Маладая жонка».
20.30, 2.30 Кінараман «Два жыцці». 1-я серыя.
22.30, 4.30 Кінараман «Два жыцці». 2-я серыя.

ДОМ КІНО

3.00 Дэтэктыў «Першае правіла каралевы».
6.30 Серыял «Участак», заключная серыя.
7.30, 18.00, 2.05 Серыял «Сінія ночы».
8.30 Гістарычны фільм «Адмірал Ушакоў».
10.20 Новы хіт. Камедыя «На мора».
12.00 Кінараман «У дзень свята».
13.30 Сусветная прэм'ера. Ваенная меладрама «Рабінавы вальс».
15.15 Зорны панядзелак. Любоў Талкаліна ў меладраме «Бяражы мяне, дождж».
16.55, 18.55, 2.00 «Акно ў кіно».
17.05 Серыял «Зачараваны ўчастак». 1-я серыя.
19.00 Зорны панядзелак. Любоў Талкаліна ў авантурнай камедыі «Залаты ключык».
21.00 Зорны панядзелак. Любоў Талкаліна ў драме «Аднойчы ў правінцыі».
22.50 Меладрама «Мелодыі белай ночы».
0.25 Кароткаметражны фільм «Прывітанне, сусед!».
0.55 Меладрама «Незвычайнае лета», 1-я серыя.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
5.15, 2.20 Серыял «Няўдачнік».
6.15 Маст. фільм «Гаспадар у доме».
8.00 Маст. фільм «Вар'яцтва».
8.45, 10.40, 23.50 «Камедыянты. Лепшае».
9.00 Маст. фільм «Кранулы прафесар».
11.15 Маст. фільм «Санта Клаус».
12.55, 16.25, 21.00 Серыял «Камп'ютаршчыкі».
14.10 Маст. фільм «Падняць якары».
17.20 Маст. фільм «15-га жніўня».
18.00 «І ўсё-такі мора!..». Фільм-канцэрт. 1974 год.
23.00 «Быў час». 2009 год.
0.00 «Ранішняя пошта» ў Алма-Аце. 1984 год.
0.35 «Што? Дзе? Калі?». Фінальная гульня. 1980 год.
2.00 «Трыбунал» Наталлі Мядзведзевай. 1995 год.
3.00 «Двайныя непрыемнасці». Музычны фільм.
4.30 «Міжнародны турызм у СССР». Дак. фільм.

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Драма «Мужчынская размова».
3.30, 9.30, 15.30 М/с «Доктар Айбаліт», фільм 1. М/ф «Караблік».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Робін Гуд». Казкі народаў свету. «Выкананне жаданняў».
5.00, 11.00, 17.00 Кінаапавесць «Рыцар з Княж-гарадка». Зборнік м/ф. «Карцінкі з выстаўкі». «Таму, што ў кузні не было цвіка».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Фархат — прынц Персіі».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Успамін». «Я чакаю цябе, кіт». «Зялёны конік».

ТЭЛЕКЛУБ

20.00 Серыял «Штрафбат».
21.00 Серыял «Прынцып Хабарава».
22.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
23.00 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-2».
0.00 Серыял «Чароўнасць зла».
1.00 Серыял «Аэрапорт-2».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.30, 15.30 «Камісар Мегрэ». Серыял.
9.30, 18.30, 3.35 «Фатмагуль». Серыял.
11.05, 2.40 «Планета Зямля».
12.05 «Перл Харбар». Маст. фільм.
16.30, 1.50 «Легенда пра Шукальніка». Серыял.
17.30, 23.05 «Паліцыя Гаваяў». Серыял.
20.15 «М.У.Р». Серыял.
21.15 «Няўлоўны». Маст. фільм.
0.00 «Сапраўдная кроў». Серыял.
1.00 «Мерцвякі, якія ходзяць». Серыял.
5.00 «Жыццё».

ТБ1000

5.00 Драма «Кастрычніцкае неба».
6.55 Камедыя «Скубі-ду 2: Монстры на волі».
9.00, 1.00 Камедыя «Браты Саламон».
11.00 Трылер «Улада страху».
13.30 Драма «Хросны бацька: Частка 3».
17.00 Драма «Перад захадам сонца».
19.00 Баявік «Прарок».
21.00 Драма «Хлопчыкі вяртаюцца».
23.00 Драма «Каханне і іншыя абставіны».
3.00 Трылер «Адважная».

РУССКОЕ КИНО ТВ1000

6.00 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Кароль шантажу».
7.15 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Смяротная схватка».
8.30 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Паляванне на тыгра».
10.00 Меладрама «Пацалунак скрозь сцяну».
12.00 Камедыя «Блакітныя горы, або Непраўдападобная гісторыя».
14.00 Драма «Радзіма або смерць».
16.00 Драма «Італьянец».
18.00 Маст. фільм «Мінесота».
20.00 Трылер «Рускі трохвугольнік».
22.10 Трагікамедыя «Фіга. Ро».
23.55 Драма «Рэтрум».
1.30 Маст. фільм «Мішэнь».
4.10 Драма «Помста — майстэрства, або «Падай, ты забіты!».

ІЛЮЗІЁН

0.30 Нянька па выкліку.
2.05, 23.00 Даверся мужчыну
3.40 Дарагі Джон.
5.25 Хаціка: Самы адданы сябар.
6.55 Хлопец Ікс.
8.35 Арол Дзявятага легіёна.
10.30 Маладая Вікторыя.
12.20 Адважныя.
14.05 Правілы бою.
16.15 Стукачка.
18.05 Шырока крочачы.
19.30 Гульцы.
20.55 Праўда і нічога акрамя.

«CBS DRAMA»

7.00 Плата не па заслугах.
7.50 Парадоксы кахання.
8.40, 12.50, 17.50 Дымок саствала.
9.30, 14.30, 21.10 Дынастыя.
10.20, 16.10, 3.20 Тайны айца Даўлінга.
11.10, 15.20, 20.20 Дыягназ: Забойства.
12.00, 17.00, 2.25 Гаваі 5-0.
13.40, 19.30, 23.40 Строга на поўдзень.
18.40, 22.00, 0.35 4400.
22.50, 1.30 Твін Пікс.
4.15 Пражыць жыццё.
5.10 Мая Папялушка.
Сёння Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь уваходзіць у лік буйнейшых ВНУ краіны. 11 факультэтаў навучальнай установы — агульнавайсковы, сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання, супрацьпаветранай абароны, ваеннай разведкі, авіяцыйны, унутраных войскаў, ракетных войскаў і артылерыі, ваенна-дыпламатычны, факультэт падрыхтоўкі замежных ваеннаслужачых, камандна-штабны факультэт і факультэт Генеральнага штаба — рыхтуюць вайскоўцаў па 21 спецыяльнасці, 6 кірунках і 34 спецыялізацыях, што амаль цалкам забяспечвае патрэбу Узброеных Сіл і іншых сілавых структур краіны ў афіцэрскіх кадрах.

Адукацыя, атрыманая ў зенітна-ракетным вучылішчы, высока цанілася і за мяжой. Падрыхтоўка замежных ваеннаслужачых вядзецца ў Мінску з 1963 года. За 50 гадоў было падрыхтавана каля 4800 спецыялістаў з 42 краін. Сёння ў Ваеннай акадэміі вучацца курсанты з Венесуэлы, Казахстана, Туркменістана, Кітая і іншых краін.

Размяркоўваліся выпускнікі МВІЗРВ па гарнізонах ад вострава Саарэмаа, што ў Балтыйскім моры, да Камандорскіх астравоў, што за Камчаткай. У тым ліку былі размеркаванні і на навукова-даследчыя палігоны. Выпускнікі МВІЗРВ станавіліся не толькі ваеначальнікамі, а і выдатнымі навукоўцамі. 67 выпускнікоў зенітна-ракетнага вучылішча — дактары тэхнічных навук, прафесары. Генералаў налічваецца больш за 70! Адзін з іх — нават генерал арміі Валянцін Карабельнікаў.

Трэба адзначыць, што на той час зенітна-ракетнае вучылішча сярод 269 ваенных ВНУ Савецкага Саюза ўваходзіла ў дзясятку лепшых. Студэнты МВІЗРВ лічыліся вайсковай элітай. Курсанты карысталіся папулярнасцю і ў беларускіх дзяўчат, якія не ўпускалі моманту наведаць мясцовыя танцы. Вылучаліся будучыя афіцэры і добрай стыпендыяй.

— Для параўнання: у студэнта БДУ тады стыпендыя была амаль удвая меншай, — успамінае Валерый Бялько. — За гэтыя грошы можна было купіць 2 якасныя кашулі. Ці, напрыклад, на працягу цэлага месяца штодзень есці марозіва і хадзіць у кіно.

А большага курсантам і не было трэба. Яны, як прадстаўнікі іншых ВНУ, не хваляваліся пра тое, дзе знайсці грошы на абед, і не думалі, як заплаціць за кватэру: 3 гады жылі ў казарме, 2 — у інтэрнаце. Зараз, дарэчы, наадварот. Толькі і сучасным курсантам на ўмовы жыцця скардзіцца няма чаго. Ды і стыпендыя ў іх і сёння такая, што студэнт грамадзянскай ВНУ можа пазайздросціць!

Дзмітрый Вярцінскі ўвогуле на жыццё не скардзіцца: за выдатныя заслугі ў навуковай дзейнасці і добрую вучобу ён з'яўляецца двойчы стыпендыятам Прэзідэнцкай прэміі, членам Савета Ваеннай акадэміі. Летась, яшчэ трэцякурснікам, юнак быў залічаны ў рэзерв навуковых кадраў акадэміі. Гэта вельмі прэстыжна: у рэзерв звычайна трапляюць вопытныя супрацоўнікі ВНУ!

— Сёння сярод моладзі існуе такая думка, што прэстыж афіцэрскай прафесіі ўпаў, — разважае курсант 4-га курса факультэта супрацьпаветранай абароны. — Я з гэтым катэгарычна нязгодны! Скажу больш: далёка не кожны тут можа вучыцца!

Вераніка КАНЮТА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

■ Векапомнае

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ ПЛОШЧЫ,

альбо Як моцна мы верылі ў перамогу

Плошча Перамогі і абеліск на ёй ужо даўно сталі адной з візітных картак Мінска. Сёння нават цяжка ўявіць, што гэтае месца магло выглядаць неяк па-іншаму, і ўвогуле помніка тут калісьці не было.

МЕМАРЫЯЛ ЗАДУМВАЎСЯ ЯШЧЭ ПАДЧАС ВАЙНЫ

Пасля Вялікай Айчыннай вайны на месцы сучаснага 38-метровага абеліска з шэрага граніту, увянчанага ордэнам Перамогі, ляжаў просты мемарыяльны камень. Сам жа помнік быў адкрыты да дзясятай гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — у 1954 годзе. Перад гэтым у 1946 годзе быў абвешчаны ўсесаюзны конкурс на стварэнне праекта мемарыяла, у якім перамаглі архітэктары Г. Заборскі і У. Кароль. Падчас адкрыцця помніка Георгій Заборскі прызнаўся, што пачаў ствараць праект яшчэ падчас вайны, у 1942 годзе, таму што моцна верыў у Перамогу.

Планавалася, што помнік усталююць на Цэнтральнай плошчы горада — гэта значыць, на цяперашняй Кастрычніцкай. Але чамусьці месца яго ўзвядзення змянілі на Круглую плошчу (менавіта так называлася Плошча Перамогі да лістапада 1958 года). Ды і сам мемарыял павінен быў выглядаць крыху інакш: вышэйшым на 10 метраў, а ў якасці матэрыялу планавалася выкарыстоўваць белы мармур з ружовым адценнем. Але дойліды не ўкладваліся ні ў грашовыя сродкі, ні ў тэрміны здачы, таму вырашылі стварыць «бюджэтны» варыянт помніка і здаць яго своечасова.

БАЙКА ПРА ЛЕНІНА... БЕЗ ВУХА

Абмежаванні ў часе і сродках не паўплывалі на сэнсавае напаўненне манумента. Як сімвал Перамогі, у аснове абеліска ляжыць меч, абвіты лаўровай галінкай з бронзы. Чатыры бронзавыя вянкі вакол помніка сімвалізуюць чатыры франты, якія вызвалялі Беларусь. Грані абеліска аздоблены бронзавымі гарэльефамі: «9 Мая 1945 года» (скульптар А. Бембель), «Партызаны Беларусі» (А. Глебаў), «Слава паўшым героям» (З. Азгур), «Савецкая Армія ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (С. Селіханаў). Экскурсавод Яўгенія Быц распавяла такую гісторыю: «На адным з гарэльефаў былі выявы профіляў Сталіна і Леніна. Але пасля развянчання культу асобы профіль Сталіна з гарэльефа прыбралі, і Ленін, мала таго, што застаўся на ім у адзіноце, дык яшчэ і даволі доўгі час з-за гэтага быў без вуха». Але праўда гэта ці не, сёння ніхто пацвердзіць не можа.

ЯК ЛАМАНОСАЎ «ПРЫКЛАЎ РУКУ» ДА ПОМНІКА

Яшчэ адну байку, звязаную з помнікам, узгадаў экскурсавод Павел Дзюсекаў: «Міхаіл Ламаносаў праяўляў свае здольнасці ў розных галінах. Адным з яго захапленняў была выплаўка каляровага шкла. Калі ў Мінску будавалі помнік Перамогі, у Маскве ішлі раскопкі. Падчас іх была знойдзена майстэрня Ламаносава, дзе ён і займаўся выплаўкай каляровага шкла. Калі паглядзець на зорку, што вянчае помнік, можна ўбачыць чырвоны фон. Гэта і ёсць тое самае шкло, што прывезлі да нас з майстэрні Ламаносава, і ён у прамым сэнсе гэтае шкло кранаў». Зрэшты, хутчэй за ўсё, гэта толькі прыгожая легенда, бо існуюць звесткі, што мазаіку для ордэна Перамогі даслалі з Акадэміі мастацтваў Ленінграда.

У ГОНАР ГЕРОЯЎ: ГАРАДОЎ І ЛЮДЗЕЙ

Будынкі, размешчаныя вакол Плошчы, былі ўзведзены ў 1950-я гады. Аднак архітэктурны ансамбль пачаў фарміравацца яшчэ ў 1930-я гады. Тады ж былі пабудаваны і два паўкруглыя дамы, якія падчас вайны былі моцна разбураны.

Каля падножжа помніка ў дзень 17-й гадавіны вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 3 ліпеня 1961 года ганаровы грамадзянін горада, Герой Савецкага Саюза генерал-палкоўнік А.С. Бурдзейны запаліў Вечны агонь.

У 1984 годзе ў сувязі з пачаткам працы Мінскага метрапалітэна плошчу перапланавалі з круглай у авальную. У гэтым жа годзе, 1 ліпеня, на плошчы ўсталявалі пастаменты з капсуламі з зямлёй гарадоў-герояў Масквы, Ленінграда, Валгограда, Кіева, Адэсы, Севастопаля, Керчы, Новарасійска, Тулы, Брэсцкай крэпасці. У 1985 годзе — капсулы з зямлёй гарадоў-герояў Смаленска і Мурманска.

А напярэдадні 40-годдзя Перамогі ў падземным пераходзе пад помнікам была адкрыта мемарыяльная зала ў гонар ураджэнцаў Беларусі і іншых рэспублік, якія вызвалялі нашу зямлю і былі ўшанаваны званнем Героя Савецкага Саюза.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Слова — партызану

У ВЕРАСНІ 43-ГА

Партызанам атрада імя С. М. Будзённага ўраджэнец вёскі Доктаравічы, што на Капыльшчыне, Іван Казлоў стаў у кастрычніку 1942 года. У свае 23 гады юнак карыстаўся ў атрадзе вялікай павагай. І не дзіўна — яму проста «шанцавала» на баявыя подзвігі: узарваў мост на дарозе Слуцк — Капыль, з групай партызан у родным саўгасе знішчыў спіртзавод з 34 гітлераўцамі, удзельнічаў у 15 баях і дробных сутычках з фашыстамі і паліцаямі, разам з атрадам падарваў 540 рэек на чыгунцы... Адразу пасля вызвалення Беларусі, у 1944 годзе, Іван Казлоў уладкаваўся журналістам у «Звязду», дзе адпрацаваў 40 гадоў! Пісаў так, што вачэй не адарваць ад тэксту. Працаваў прадуктыўна: як кажуць, ні дня без радка. Ёсць што яму расказаць і сёння...

«Капыльшчына... Лясы і пералескі, узвышша і ўзгоркі... На геаграфічнай карце Беларусі — Капыльская града, адкуль бяруць пачаткі вытокі Нёмана: Лань, Марач, Случ. Тут у гады Вялікай Айчыннай вайны народныя мсціўцы вялі бязлітасную барацьбу з гітлераўскімі акупантамі. На Капыльшчыне і ў суседніх раёнах дзейнічала партызанскае злучэнне Слуцкай зоны.

Мноства баявых аперацый фіксуе ў гэтых мясцінах летапіс партызанскай вайны. Сярод іх — разгром фашысцкага гарнізона і чыгуначнай станцыі ў Цімкавічах, бітвы ў Старыцкім і Лаўскім лясах, знішчэнне нямецкага гарнізона ў саўгасе «Доктаравічы»...

Летам 1943 года па рашэнні ЦК КПБ і Беларускага штаба партызанскага руху брыгады Слуцкай зоны вылучылі са свайго складу тысячу загартаваных у баях партызан для перакідання іх на Беласточчыну. У гэтую баявую групу быў уключаны і атрад «За Радзіму», якім камандаваў Міхаіл Янкоўскі. У выніку, на базе атрада была створана партызанская брыгада «За Радзіму».

Паводле ўспамінаў камандзіра партызанскай брыгады Міхаіла Янкоўскага:

— Баявы рэйд з Капыльшчыны да берагоў Заходняга Буга і Аўгустоўскіх лясоў пачаўся ў верасні 1943 года. У лясных масівах на поўдзень ад Баранавічаў самалёты з Вялікай зямлі скінулі нам боепрыпасы, зброю, міны, медыкаменты — усё неабходнае для дзеянняў у глыбокім тыле ворага. Злучэнне пад камандаваннем генерал-маёра Філіпа Капусты адправілася ў нялёгкі шлях...

Да сярэдзіны кастрычніка мы прайшлі Капыльскі, Клецкі, Ляхавіцкі і Івацэвіцкі раёны. 21 кастрычніка з боем фарсіравалі чыгуначную магістраль Мінск — Брэст, што на поўдзень ад Картуз-Бярозы, і неўзабаве прыйшлі на свае зыходныя пазіцыі — у Ружанскую пушчу. Шмат гарачых баёў было й нас з фашысцкімі акупантамі на гэтым шляху, але перашкодзіць рэйду народных мсціўцаў захопнікі не змаглі.

У далейшым партызанскай брыгадзе «За Радзіму» давялося працягваць баявы рэйд з Ружанскай пушчы ў Рудкоўскі лес, што на Заходнім Бугу. Тут была вызначана зона яе дзеянняў, у якую ўваходзілі Белавежская пушча і яшчэ некалькі раёнаў Беласточчыны і Брэстчыны.

Шмат расказваў Міхаіл Рыгоравіч пра тое, як народныя мсціўцы ахоўвалі ў той ваенны час ад фашысцкіх захопнікаў фаўну і флору Белавежскай запаведнай гаспадаркі, як перашкаджалі вывазу ў Германію нарабаванай гітлераўцамі маёмасці. Дбалі тады партызаны і пра такі клопат.

Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

■ Была вайна

СМУТАК І РАДАСЦЬ МАЁЙ БАБУЛІ

Вёсачка Гай — маляўнічы куток Маладзечаншчыны. Да вайны тут, у лесе, багатым на грыбы і ягады, стаяла пяць хацін, жылі два роды — Буракоў і Ганаў.

У маёй бабулі было тры сыны — Мечыслаў, Эдуард і Віктар і адна дачушка Уладзя. У чэрвені 1941-га яна з сяброўкай пайшла ў ягады. Па дарозе назад дзяўчаты заўважылі немца. Вядома ж, спалохаліся і хуценька пабеглі дамоў. Але Уладзя пры гэтым азірнулася. І адразу ж раздаўся стрэл. Куля прайшла праз лёгкія. Дзяўчына ўпала. Сяброўка яе прыбегла ў вёску, расказала аб тым, што адбылося. Раненую дзяўчыну хутка прынеслі дахаты. Прыйшоў і нямецкі лекар, зрабіў перавязку, але праз дзве гадзіны Уладзя памерла.

З той мінуты мая бабуля ніколі не скідала чорнай хусткі.

...Маладзейшых жыхароў вёскі каго забралі ў войска, каго вывезлі на працу ў Германію. Да тых, што засталіся, амаль кожную ноч прыходзілі партызаны — каб пераапрануцца, памыцца, перакусіць. А днём прыходзілі немцы. Забіралі курэй, свіней.

Падазраючы жыхароў у кантактах з партызанамі, фашысты хацелі наш Гай спаліць. Выратаваў яго ксёндз Пётр Пупін. Ён добра ведаў нямецкую мову і неяк жа змог упрасіць, угаварыць акупантаў!

Але яны забіралі вяскоўцаў у лагер, які размяшчаўся ў мястэчку Краснае. Трапіў туды і мой бацька. Потым яму з сябрам удалося збегчы, схавацца ў суседняй вёсцы.

А яшчэ немцы зганялі мясцовых мужчын «баранаваць» дарогу і такім чынам правяраць, ці няма там мін. Аднаго з бацькавых стрыечных братоў гэткая праверка пакінула без рукі, а другога — без вока.

...На фронце былі ўсе тры бабуліны сыны (мой бацька дайшоў да Одэра, быў цяжка паранены, перамогу сустрэў у шпіталі). Але ж, галоўнае, усе яны засталіся ў жывых. І гэта была найвялікшая бабуліна радасць!

Галіна ШУКЕЛА,
г. Мядзел

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
Государственное производственное объединение «Минскстрой»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00-14.00,
тел. 327 52 36, 226 03 01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2006 по 2011 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

— ул.Матусевича, д.90, пр-т Рокоссовского, д.76, д.78, пр.Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д.168, корп. 3, ул.Есенина, д. 40, ул. Есенина, д. 42, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52, д. 72, ул.Папанина, д.18, ул. Стариновская, д. 2, ул. Колесникова, д.16, д.18, д. 20 и др.

Объединение осуществляет строительство объекта «Многоэтажный жилой дом неповышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная Горка-3» (жилой дом).

Свидетельство (удостоверение) № 500/1323-240 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 02 декабря 2011года.

Земельный участок площадью 0,1841 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано односекционным, 25-этажным. Количество жилых помещений жилого дома — 249. Серия жилого дома — индивидуальная.

Начало строительства жилого дома — апрель 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС — декабрь 2014 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 09.09.2010 № 945-60/10 с дополнением № 427-60/11 от 13.06.2011.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир № № 23, 24, 25, 26, с 63 по 69, с73 по 79, с 83 по 89, с 93 по 99, с 103 по 109, с113 по 119, с 123 по 129, с 133 по 139, с 143 по 149, с 153 по 159, с 163 по 169, с 173 по 179, с 183 по 189, с 193 по 199, с 203 по 209, с 213 по 219, с 223 по 229, с 233 по 239, с 243 по 249.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

однокомнатные квартиры — 13 929 540 руб.,
двухкомнатные квартиры — 13 386 991 руб.,
трехкомнатные квартиры — 13 061 461 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 01.04.2013 № 117С-03-13, генподрядчик — ОАО «Стройтрест № 35». Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с договором строительного подряда — декабрь 2014 г.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) и договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул.К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке через 7 календарных дней после опубликования настоящей проектной декларации.

Генеральный директор Н.В. Милошевский

БПС-СБЕРБАНК

В связи со снижением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 27% до 25% годовых, ОАО «БПС-Сбербанк» с 15.05.2013 устанавливает по срочным банковским депозитам физических лиц в белорусских рублях следующий размер процентов:

1. По вновь привлекаемым и автоматически продлеваемым депозитам

Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 15.05.2013 – 25% годовых

Наименование депозита / сумма вклада	Размер процентов (годовых) по срокам привлечения				
	90-189 дней	190-369 дней	370-500 дней	501-750 дней	751-1000 дней
«Сохраняй»					
от 500 тыс. – до 5 млн.	19,5 (СР-5,5 п.п.)	21,75 (СР-3,25)	23,75 (СР-1,25 п.п.)	25,75 (СР+0,75 п.п.)	27,75 (СР+2,75 п.п.)
от 5 млн. – до 25 млн.	21 (СР-4 п.п.)	22,75 (СР-2,25 п.п.)	25(СР)	27 (СР+2 п.п.)	29 (СР+4 п.п.)
от 25 млн. – до 100 млн.	21,75 (СР-3,25 п.п.)	23,5 (СР-1,5 п.п.)	25,5 (СР+0,5 п.п.)	27,75 (СР+2,75 п.п.)	29,75 (СР+4,75 п.п.)
от 100 млн.	22 (СР-3 п.п.)	23,75 (СР-1,25 п.п.)	26 (СР+1 п.п.)	28 (СР+3 п.п.)	30 (СР+5 п.п.)
«Пополняй»					
от 500 тыс. – до 5 млн.	19,25 (СР-5,75 п.п.)	21,5 (СР-3,5 п.п.)	23,5 (СР-1,5 п.п.)	25,5 (СР+0,5 п.п.)	27,5 (СР+2,5 п.п.)
от 5 млн. – до 25 млн.	20,75 (СР-4,25 п.п.)	22,5 (СР-2,5 п.п.)	24,75 (СР-0,25 п.п.)	26,75 (СР+1,75 п.п.)	28,75 (СР+3,75 п.п.)
от 25 млн. – до 50 млн.	21,5 (СР-3,5 п.п.)	23,25 (СР-1,75 п.п.)	25,25 (СР+0,25 п.п.)	27,5 (СР+2,5 п.п.)	29,5 (СР+4,5 п.п.)
от 50 млн. – до 100 млн.	21,75 (СР-3,25 п.п.)	23,5 (СР-1,5 п.п.)	25,5 (СР+0,5 п.п.)	27,75 (СР+2,75 п.п.)	29,75 (СР+4,75 п.п.)
от 100 млн.	21,9 (СР-3,1 п.п.)	23,7 (СР-1,3 п.п.)	25,9 (СР+0,9 п.п.)	27,9 (СР+2,9 п.п.)	29,9 (СР+4,9 п.п.)

Наименование депозита / неснижаемый остаток					
«Управляй»					
1,5 млн.	14(СР-11 п.п.)	16(СР-9 п.п.)	18(СР-7 п.п.)	20(СР-5 п.п.)	22(СР-3 п.п.)
5 млн.	15(СР-10 п.п.)	17(СР-8 п.п.)	19(СР-6 п.п.)	21(СР-4 п.п.)	23(СР-2 п.п.)
25 млн.	18(СР-7п.п.)	21(СР-4 п.п.)	23(СР-2 п.п.)	25(СР)	27(СР+2 п.п.)
100 млн.	19(СР-6 п.п.)	22(СР-3 п.п.)	24(СР-1 п.п.)	26(СР+1 п.п.)	28(СР+3 п.п.)
Депозит и текущий (расчетный) счет с использованием банковской платежной карточки «Пенсионный» – 25 (СР)					

2. По депозитам, прием которых прекращен

Наименование депозита	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)
«Перспективный»	18 месяцев	22,5(СР –2,5)
«К совершеннолетию»	2 года	28(СР + 3)
	3 года	29(СР + 4)

По депозитам, привлеченным до 15.05.2013, и депозитам, прием которых прекращен, установленный размер процентов будет применен с 15.06.2013.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по единому короткому номеру 148

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2012 г. (млрд. руб.): январь — 25,9; февраль — 27,7; март — 29,6; апрель — 27,1; май — 26,4; июнь — 23,2; июль — 21,6; август — 20,2; сентябрь — 16,6; октябрь — 16,9; ноябрь — 17,9; декабрь — 17,7.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Сбербанк».

«...ЯК ЯЎСЕЕЎ КАЎНЕР»

Адбылося гэта даўно, у мінулым стагоддзі, ці, як людзі старыя кажуць, пры першых Саветах. Нейкія грошы ў вяскоўцаў тады ўжо з'явіліся, а вось каб нешта купіць за іх... Тавараў днём з агнём не знайсці! Ад чаго, як звычайна, некаму клопат ды боль галаўны, а некаму — чыстая выгада: па вёсках, па хатах сталі хадзіць то цыганы, то розныя іншыя дзялкі, прапаноўваць людзям абутак, адзенне, розныя тканіны. Ішоў гандаль. Часцяком — нават пад заказ. Гэта значыць, што з людзей збіраліся грошы, а вось прывезці патрэбныя тавары ім толькі абяцалі...

Не скажу, можа, дзесь і прывозілі. У нас жа...

Неяк зайшлі гэтыя дзялкі ў хату да дзядзькі Яўсея. І так ужо сталі расхвальваць кашулі, што зацікавіўся гаспадар — дастаў свой кашалёк, адлічыў патрэбную суму. Прывозьце, маўляў, бяру!

Госці, вядома ж, рады. Згрэблі яны тыя грошы і развіталіся, у наступную вёску пайшлі. А Яўсей дома сядзіць ды пра сваю абноўку думае, нават уяўляе, як адзене, прыбярэцца... І тут... Апамятаўся дзядзька, што не ўсё сказаў гандлярам...

Даўся за імі следам, дагнаў ажно заваколіцай. Кажа: «Людцы, вы ж глядзіце, каб у маёй кашулі ды хаця каўнер свабодны быў, каб не ціснуў. Бо дужа ж я не люблю...».

Як і варта было чакаць, не прыждаў заказчык абяцанай абноўкі. Зрэшты, іншыя вяскоўцы таксама... Але ж з саміх сябе смяяцца не будзеш. А вось з дзядзькі Яўсея, з яго каўняра, — можна. То і тады ад душы пасмяяліся, і цяпер, калі бачаць на некім штось завялікае, дык адразу і кажуць: «Свабоднае, як Яўсееў каўнер».

Сяргей Ярмольчык,
вёска Багданаўка, Лунінецкі раён

НУ І ХТО Ж «ПНЁМ ПЕНЬ»?

Раней, як вядома, бензін каштаваў капейкі. Ды і на крадзеным шмат хто ездзіў. Магчыма, таму людзі і падвозілі адзін аднаго, і нават некуды вазілі, а грошай за тое не бралі. Цяпер жа іншая справа: хочаш некуды з камфортам дабрацца, дык, калі ласачка, заплаці — і за бензін, і за паслугу...

Дык вось. Аднаму знаёмаму дзеду трэба было ў Гомель матнуцца. На дызелі яно б, вядома ж, танней, але дзед глухі, як цяцера. Унука папрасіў: каб падвёз яго і каб там дапамог слыхавы апарат набыць.

Хлопец роднаму дзеду, дзякаваць Богу, не адмовіў. А каб у дарозе трохі весялей было (з глухім размовы вядомыя), сябрука ў кампанію ўзяў. Адным духам яны даляцелі да Гомеля, уладзілі дзедавы справы, едуць назад, ужо нават Буда-Кашалёў мінулі, але ж вырашылі спыніцца, «у кусцікі» схадзіць.

— Ты ж глядзі, не заблудзіся тут, — наказалі дзеду.

Той штось прамармытаў.

— Пнём пень! Далібог! — паскардзіўся на яго ўнук. Думаў, што стары не чуе. А той жа апарат прыдбаў!

Але прамаўчаў.

У ляску разышліся: дзед у адзін бок падаўся, хлопцы ў другі. Яны яшчэ пастаялі там, пакурылі, свежым паветрам падыхалі. І гаманілі ж, відаць... Не іначай пра дзевак, бо потым селі ў машыну і паехалі. Кіламетраў сорак адматалі, з гомельскай трасы ўжо на Жлобін звярнулі і толькі тут агледзеліся, што дзеда ў машыне няма...

Што рабіць? Развярнуліся — пагналі назад.

...Думаеце, дзед увесь гэты час хваляваўся? Не. Ён выйшаў на дарогу, убачыў, што машыны няма, але ж па-філасофску разважыў, што нікуды яна не дзенецца — будзе. Пахадзіў па лесе яшчэ, новымі «вушамі» птушак паслухаў, прысеў на ўскрайку.

Бачыць — нясецца ўнукава машына, разварочваецца, каля ног спыняецца і нават дзверцы «сама» адчыняе...

Нічога стары не сказаў, сеў у машыну. Але ж крыўду затаіў і давёз яе амаль дадому. Толькі там ужо папытаўся:

— Ну і хто з нас «пень пнём»?

Хлопцы прамаўчалі. А каб лепей засвоілі, дзед іх рублём пакараў. Гэта значыць, аплацію бензін толькі за 250 кіламетраў дарогі, бо лішнія 80 яны ж па сваёй дурасці адматалі.

Соф'я Кусянкова,
в. Лучын Рагачоўскі раён.

РЫБАЛКА ПА-ДАРОСЛАМУ

...Мне тады гадоў сем ці восем было. Здабытчык: ледзь вольная часіна — адразу на рэчку, на рыбу. Дарослыя, вядома ж, таксама хадзілі. І куды болей лавілі, бо ў іх жа сапраўдны рыштунак быў. Не тое, што ў дзятвы — вудзільны з нейкай арэшыны ды звіты конскі волас замест лёскі...

Але ж, бывала, што і нам шанцавала — кіло па два плотак-акунькоў прыносілі! Праўда, рэдка, часцей з пустымі рукамі дамоў прыходзілі.

І вось неяк паехаў мой бацька ў горад на рынак і прывёз адтуль сапраўдную пяцікаленную вуду! І да яе — сапраўдную лёску!.. Як у дарослых!

Радасці было — аж пад неба! Я не мог дачакацца заўтрашняга дня. З вечара накапаў чарвякоў...

Не памятаю, спаў ці не, але ж устаў раней за сонца, узяў усе свае прылады і рушыў да рэчкі, на тое месца, дзе ўчора вудзілі дарослыя. Расклаў там вуду, зачапіў чарвяка, закінуў як мага далей, да болю ў вачах глядзеў на паплавок — марна.

Не раз і не два правяраў насадку, закідваў, пераходзіў на іншае месца. І...

І вось яна — мая ўдача! Паплавок адразу нырнуў, пайшоў на глыбіню. Я, пачакаўшы крыху, пацягнуў вудзільна... На канцы нешта затрымцела, але ж... ні з месца. І што я ні рабіў... Была б старая вуда, ліха з ёй — пацягнуў бы, не шкадуючы, а тут...

Распрануўся, палез у ваду. Узяўшыся рукой за лёску, нырнуў. Паспеў заўважыць, што мой кручок знаходзіцца ўнутры жака, зробленага з капронавых нітак, які нехта паставіў, прывязаўшы да двух калоў, каб не знесла цячэннем...

Прыйшлося ныраць яшчэ і яшчэ, каб выцягнуць калы і, нарэшце, сам жак.

На беразе ўбачыў, што ў ім аж пяць вялікіх рыбін, адна з якіх і праглынула маю прынаду. Давялося паваждацца, пакуль вызваліў кручок. А ўжо далей...

Зматаў я свае вудачкі — і ходу.

— Косцік, ты чаму так рана? — папытаўся бацька. — Сама ж бярэцца цяпер.

Але зірнуў у вядро і вачам не паверыў:

— Сынок, і калі ж ты паспеў? Малайчына! Столькі нацягаў! Вось што значыць добрыя прылады!

Я на гэта не сказаў нічога, бо ў мяне, як той казаў, зуб на зуб не трапляў ад холаду.

...Вось такой была мая першая рыбалка з новым вудзільнам. Служыла яно мне доўга, але ж болей такіх «уловаў» не было.

Дарэчы, праўду пра той, першы, не расказваў ніколі і нікому — нават роднаму бацьку...

Толькі цяпер — чытачам любімай газеты і любімай рубрыкі.

К.П., *Мёрскі раён.*

У ЦЁМНЫМ ЛЕСЕ

...Мой прыяцель Сашка працуе кіроўцам на лесавозе. Таму яго маршруты пралягаюць найбольш па лясах. Але ж, як высвятляецца, і цікавых людзей сустрэць, і ў нейкую гісторыю трапіць можна і там.

Ехаў ён неяк у апошні рэйс. На пагрузачныя работы аператара з сабой прыхапіў. Хлопец той жвавы, рот не закрываецца, бо з кім ты ў лесе пагаворыш...

На шашу тым часам звярнулі. І тут пасажыр як закрычыць:

— Глянь... Глянь, якія лялькі!.. І галасуюць...

— Ну і што? — пытае кіроўца, бо ў яго ж дома жонка, дзеці, цешча...

— Як што?! Тармазі!

Дзеўкі між тым ужо згледзелі, што машына хуткасць скінула — рукамі махаюць, за лесавозам бягуць... Можа, ад радасці (Сашка думае), а можа, ад холаду, бо на дварэ далёка не май, а на іх з адзежы па дзве маленькія анучкі ўсяго — толькі сорам прыкрыты.

Кабіна ў «МАЗа» прасторная, месца пасажыркам хапіла. Ды вось жа ліха: перадача не ўключаецца! Сашка рычагі з усіх сіл цягае! Дзеўцы, што побач села, нават па назе ўжо добра загрэў... І без выніку!

— Мусіць, счапленне «абрэзала», — з выглядам знаўцы прамовіў аператар.

Ну і Сашку ж перад дзеўкамі няёмка. Сабраў ён у кулак усю сваю сілу, рвануў за рычаг...

Цягач крануўся, але ж пры гэтым Сашкава рука заляцела аж да самага дзявочага сцягна... Горш за тое, дроцік (Сашка ім манжэту ў кашулі счапіў, бо гузік вырваўся...) зачапіўся за адну з тых «анучак», што прыкрывалі дзявочы сорам. І назад — ніяк... Толькі з тою «анучкай»...

Што рабіць?! Спыняцца? А як зноў не завядзешся? Ехаць? А як адной рукою руль утрымаць?

Разгубіўся Сашка. Шчасце, што дарога пустая.

Дзякаваць Богу, дзеўка не промах была, не разгубілася: прыўзняла сваю спаднічку, адчапіла Сашкаў «гузік»...

Больш у той раз прыгод не было: моўчкі дабраліся да месца. Дзяўчаты разлічыцца хацелі, Сашку грошы заплаціць. Ён не ўзяў. Сказаў, што столькі адрэналіну ў яго крыві даўно не было. І наўрад ці будзе.

А. Ліпень, *Іўеўскі раён.*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

НАСУСТРАЧ СПІЛБЕРГУ

Беларусь працягвае заваёўваць Каны

Як ні дзіўна гучыць спалучэнне «Каны — Спілберг», а журы сёлетняга 66-га Канскага кінафестывалю, аднаго з самых уплывовых кінамерапрыемстваў у свеце аўтарскага кіно, узначаліць рэжысёр вядомых галівудскіх блакбастараў Стывен Спілберг. І беларускі павільён на гэтым велізарным кінарынку будзе прадстаўлены трэці раз.

Два найбуйнейшыя дзяржаўныя вытворцы кіно ў нашай краіне — Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і Беларускі відэацэнтр — адказныя за кантэнт нашага павільёна ў Канах сёлета. Яны ж ўзялі на сябе і фінансавыя выдаткі, звязаныя з утрыманнем нацыянальнага павільёна. На жаль, ніводная з прыватных кінавытворчых кампаній сёлета не далучылася да ўдзелу. Магчыма, некаторыя з іх будуць прадстаўлены на асобных стэндах канскага кінарынку, якія даюць магчымасць весці перамовы непасрэдна пра гандаль паслугамі і кінапрадукцыяй. Нацыянальны павільён не мае такога права, а ствараецца выключна для прэзентацыі кінагаліны канкрэтнай краіны.

Тым не менш **генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Алег СІЛЬВАНОВІЧ** ставіць перад павільёнам у цэлым і перад студыяй у прыватнасці тры найгалоўнейшыя задачы:

— Для нас вельмі важным з'яўляецца пошук партнёраў для сумеснай кінавытворчасці, пошук магчымасцяў рэалізацыі праектаў і шляхоў рэалізацыі ўжо існуючай беларускай кінапрадукцыі.

Так, у рамках канскага «Куточка кароткага метра» будзе прадэманстравана 4 дакументальныя і два анімацыйныя фільмы «Беларусьфільма»: «Пячнік» Алы Вольскай, «Асаблівы тэатр. У пошуках шчасця» Кацярыны Махавай, «Забраны край» Юрыя Цімафеева, «Аксана Волкава. A prima vista» Наталлі Жамойдзік; мультфільмы «Рыбка па імені Нельга—3» Аляксандра Ленкіна і «Як служыў жа я ў пана» Міхаіла Тумелі.

А рэжысёр з беларускімі каранямі Канстанцін Фам, аўтар кароткаметражнага фільма «Туфлікі» (вытворцам якога з беларускага боку выступіў Беларускі відэацэнтр) нават спадзяецца, што дыск з кінастужкай удасца перадаць самому Стывену Спілбергу. І з улікам таго, што фільм паспяхова ўдзельнічаў ужо больш чым у 10 кінафестывалях, цалкам верагодна, што і Спілбергу ён спадабаецца. А там глядзіш — і мара Міхаіла Пташука пра сумесную беларуска-галівудскую кінавытворчасць, дзякуючы якой можна было б на ўвесь свет расказаць пра Беларусь, неўзабаве здзейсніцца.

66-ы Канскі кінафестываль абяцае новыя адкрыцці. Па-першае, вельмі цікава, чаму аддасць перавагу журы на чале з галівудскім мэтрам. Да таго ж, варта адзначыць, што сёлетняе журы надзвычай стракатае, шматнацыянальнае і нават трошку экзатычнае. Так, у яго склад увайшлі: амерыканская актрыса Ніколь Кідман, індыйская актрыса Відзья Балан, японскі рэжысёр Наомі Кавасэ, чый фільм «Дух гор» нядаўна паказвалі ў Мінску ў рамках Тыдня сучаснага японскага кіно, Хрысціян Мунджу, уладальнік «Залатой пальмавай галінкі» мінулага фестывалю і вядомы аўстрыйскі акцёр Крыстаф Вальц.

Кадр з фільма «Вялікі Гэтсбі».

Па-другое, сама праграма здаецца такой стракатай і разнастайнай, без відавочных лідараў, што вынікі могуць быць самымі нечаканымі. Напрыклад, у праграме ёсць фільмы адразу некалькіх прызнаных мэтраў: Джыма Джармуша, братоў Коэнаў, Азгара Фархадзі, Такашы Міке, Франсуа Азона, Аляксандра Пэйна, Рамана Паланскі, Стывена Содэрберга, Алекса Ван Вармердама. Так што ім ёсць з кім спаборнічаць. Разам з тым як у асноўным конкурсе, так і ў альтэрнатыўных праграмах (напрыклад, «Асаблівы погляд») багата малавядомых экзатычных, але шматабяцальных прозвішчаў, сярод якіх надзвычай шмат жаночых: Валерыя Бруні Тэдэскі, Ніколас Віндзінг Рэфн, Катрын Гэбэ, Валерыя Галіно, Лусія Пуэнса, Хінэр Салем. Часта якраз фільмы незнаёмых рэжысёраў становяцца самымі вялікімі адкрыццямі, нават калі не атрымліваюць важкіх узнагарод.

А фільмам адкрыцця фестывалю стане «Вялікі Гэтсбі» База Лурмана, якога ўсе чакаюць з нецярпеннем і які з 16 мая стартуе і ў беларускім пракаце.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Мазыр натхніў юных спевакоў

Падведзены вынікі VIII Міжнароднага фестывалю юных талентаў «Зямля пад белымі крыламі», які праходзіў у Мазыры. У намінацыі «Салавакал эстрадны» Гран-пры заваяваў Ягор Шаранкоў са Светлагорска. Такой жа ўзнагародай у намінацыі «Салавакал народны» адзначана Яніна Ляўкоўская з Лельчыцаў. Харэаграфічны калектыў «Папараць-кветка» са Слуцка перамог усіх у народна-сцэнічным танцы.

У фестывалі прыняло ўдзел больш за 600 чалавек з 10 краін — у тым ліку з Расіі, Эстоніі, Украіны, Сербіі, Малдовы, Румыніі, Азербайджана, Казахстана. Патрапіць на сцэну ў Мазыры марылі многія. Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Цітовіча, прафесар, народны артыст Рэспублікі Беларусь Міхась Дрынеўскі, які ўзначаліў журы, адзначыў, што безумоўныя крытэрыі ацэнкі — толькі талент і майстэрства юных выканаўцаў.

Пятнаццаць канкурсантаў адзначаны спецыяльнымі прызамі: за волю да перамогі, вакальнае майстэрства, творчую індывідуальнасць, лепшую аранжыроўку, вернасць народным традыцыям і іншымі... Дарэчы, незаўважаным не застаўся ніхто з канкурсантаў. Для гледача ж адбылося самае галоўнае — сапраўднае свята музычнай творчасці, якое стварыла атмасферу натхнення на доўгі час.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

1883 год — 130 гадоў таму нарадзіўся (горад Лібава, цяпер Ліепая, Латвія) Янка Маўр (Іван Міхайлавіч Фёдараў), беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Дзяцінства правёў на радзіме маці — у вёсцы Лебянішкі Ковенскай губерні (цяпер Літва). Скончыў пачатковае, затым рамеснае вучылішча ў Коўне. У 1899-м паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю, аднак быў выключаны за ўдзел у гуртку рэвалюцыйнай моладзі. У 1903 годзе здаў экстэрнам іспыты і атрымаў званне настаўніка пачатковай школы. Працаваў памочнікам настаўніка ў Новым Месце (Літва), у вёсцы Бытча на Барысаўшчыне. У 1906 годзе ўдзельнічаў у нелегальным з'ездзе рэвалюцыйна настроеных настаўнікаў у вёсцы Мікалаеўшчына. Разам з Якубам Коласам і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі быў аддадзены пад суд, пазбаўлены права выкладаць у школе і ўзяты пад нагляд паліцыі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у школе, у Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, у Наркамаце асветы БССР, у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. З 1930 года — на творчай працы. Член СП СССР (з 1934). Адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры: яго аповесці «Слёзы Тубі», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады» знаёмілі дзяцей з экзотыкай далёкіх краін. Аўтар прыгодніцкіх раманаў «Палескія рабінзоны», «Амок», навукова-фантастычнай аповесці «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» і многіх іншых. Галоўнай сваёй кнігай Янка Маўр лічыў аўтабіяграфічную аповесць «Шлях з цемры». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972). Памёр у 1971 годзе.

1892 год — у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё першых дзвюх ліній конна-жалезнай дарогі, якая злучыла чыгуначныя вакзалы і ўскраінныя кварталы з цэнтрам. У першыя дні конка перавозіла прыкладна пятую частку дарослага насельніцтва горада. Першапачаткова дзейнічалі дзве лініі — Вакзальная, якая злучыла Брэсцкі і Віленскі вакзалы па вуліцах Маскоўскай і Бабруйскай, і Цэнтральная, праведзеная ад Віленскага вакзала да Саборнай плошчы. Праз тры гады была ўведзена Няміга-Захар'еўская лінія (ад сучаснага раёна парку імя Я. Купалы да вул. Рэспубліканскай, цяпер Гарадскі Вал). У 1929 годзе на змену мінскай конкі прыйшоў трамвай.

1937 год — нарадзіўся (вёска Карма Добрушскага раёна) Мікалай Арцем'евіч Калінін, беларускі кінарэжысёр. Галоўнае месца ў творчасці займала гераіка-рамантычная тэматыка. Сярод кінафільмаў: «Рудабельская рэспубліка», «Корцік», «Бронзавая птушка» і іншыя. У 1965-67 гадах у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі паставіў спектаклі «Мая старэйшая сястра» А. Валодзіна, «Дзеля жыцця» К. Губарэвіча і іншыя.

Было сказана

Аркадзь КУЛЯШОЎ (1914-1978), народны паэт Беларусі:

«Я, ўпарты, не кіну пачатае справы,
Каменне крышу,
Разграбаю пяскі —
Пад кпіны аматараў лёгкае славы
Капаю рэчышча ўласнай ракі».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Багатарэчаў. Стэк. Янка. Мінск. Ява. Дыяпазон. Гарэза. Арда. Трэска. Ака. Сектар. Тара. Мастак. Шорт. Алаш. Ася. Кара. Сакрат. Амагар. Туга. Пас. Вандраванне. Анука. Ўян. Гатака. Он!. Смалянск. Таварна.

Па вертыкалі: Аўтамат. Мантажнік. Ноанс. Акат. Тынар. Ата. Арал. Кашара. Яга. Сафа. Сцяжа. Сняжок. Мова. Пакт. Кон. Арэна. Гар. Дар. Асака. Бараскат. Разора.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.16	20.57	15.41
Віцебск	5.00	20.52	15.52
Магілёў	5.06	20.47	15.41
Гомель	5.09	20.37	15.28
Гродна	5.32	21.11	15.39
Брэст	5.39	21.06	15.27

Месяц

Маладзік у 3.29.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Анастасіі, Івана, Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Сямёна, Сяргея.*
К. *Антаніны, Антона, Ізыдара, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+20..+22°С	КІЕЎ	+27..+29°С	РЫГА	+10..+12°С
ВІЛЬНЮС	+21..+23°С	МАСКВА	+26..+28°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+12..+14°С

УСМІХНЕМСЯ

Так і не трапіў учора на рыбалку. Гэта была не самая лепшая ідэя — спачатку аб'явіць жонцы, што бяру выхадны на працы ў гадавіну вяселля, а потым патлумачыць, дзеля чаго насамрэч я яго бяру...

Жонка і муж збіраюцца снедаць:
— Мілы, хочаш, я звару кашу?
— А якую?
— Пельменевую.

Цырымонія шлюбу падыходзіць да завяршэння. Бацькі і сваякі могуць развітацца з жаніхом.

— Мама, звяжы мне шапку, а да яе шалік і світар.
— Паліто, боты, машыну і дом звязаць не трэба?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 24.610. Індэкс 63850. Зак. № 2104.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 мая 2013 года.